## *Тэма*. *Я І МАЯ ШКОЛА. ВУЧЭБНЫЯ ЗАНЯТКІ*

***Мэта:*** арганізаваць назіранне за вымаўленнем гука [ч] у беларускай мове, вучыць правільна вымаўляць гук [ч] у словах; пазнаёміць са словамі і выразамі тэматычнай групы "Вучэбныя заняткі", уводзіць іх у актыўнае выкарыстанне, фарміраваць уменні асэнсаванага ўспрымання беларускай мовы на слых, вучыць расказваць па малюнку, выхоўваць цікавасць да роднай мовы.

***Абсталяванне:*** падручнік, сшытак, каляровыя алоўкі, фламастары.

***Ход урока***

***1. Маўленчая размінка***

1) Паслухайце як я вымаўляю песеньку вераб'я і скажыце, якія асаблівасці вы пачулі?

На штыкетніку
Каля сметніку
Верабей сеў: –
Чыў-чыў-чыў! –
Свае пальчыкі лічыў.
С.Шушкевіч.

У беларускай мове гук [ч] вымаўляецца цвёрда. Вымаўленне ізаляванага гука [ч]. Назіранне за асаблівасцямі артыкуляцыі.

Чым займаўся верабей? (Вымавіць адказ хорам словамі верша.)

2) – Паслухайце лічылку і назавіце словы, у якіх ёсць гук [ч].

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі.
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

Правільна вымавіце словы з гукам [ч]. Чаму вучылі кошку? Успомніце, як вымаўляецца гук [г] у беларускай мове?

3) А цяпер вывучым лічылку. (вучні хорам паўтараюць за настаўніцай, а потым некалькі вучняў – індывідуальна.)

***2. Лексічная праца***

*Дамінуючы лексічны матэрыял: урок, перапынак, расклад урокаў, матэматыка, чытанне, пісьмо, праца, занятак, адказ вучня, пытанні настаўніка, практыкаванне, літары.*

1) Адгадайце загадкі і адкажыце на пытанні.

Як называецца той час:
Калі адзін піша белым па чорнаму,
А ўсе астатнія чорным па беламу? (урок - урок)
Сябры, пабраўшыся за рукі,
вядуць усіх нас да навукі.
Яны – у кнізе, у газеце,
Іх павінны ведаць дзеці. (буквы - літары)
Як называецца паўза паміж урокамі? (перерыв - перапынак)
Не піў, не еў.
А крычыць як ашалеў. (звонок - званок)
Куды можа клікаць школьны званок? (на ўрок і на перапынак)

2) Сягодня на ўроку мы пагаворым пра вучэбныя заняткі. Ці такія яны як у кошкі? Давайце ўспомнім, як называюцца ўрокі, якія ў вас ёсць у раскладзе (в расписании, расклад - расписание).

Математика – матэматыка
Чтение - чытанне
Письмо - пісьмо
Рисование - маляванне
Физкультура - фізкультура
Труд – праца

Якія назвы прадметаў гучаць па-другому, не так, як па-руску? (назвы прадметаў паўтараюцца хорам і індывідуальна). Як называецца час паміж урокамі?

3) Паслухайце тэкст.

У школе.

Дзеці прыйшлі ў школу. Яны падрыхтавалі да ўрока падручнікі, сшыткі, ручкі. Празвінеў званок. Вучні селі за парты. Па раскладу першы ўрок беларускай мовы. У клас заходзіць настаўніца Алена Пятроўна. Пачынаецца ўрок. Настаўніца вучыць, задае пытанні. Вучні чытаюць, пішуць, расказваюць і адказваюць на пытанні. Ім цікава. Вось і канец урока. Празвінеў званок і запрасіў (пригласил) вучняў на перапынак. Наступны ўрок – матэматыка.

Адкажыце, куды прыйшлі дзеці? Што яны рыхтуюць да ўрока? Які першы ўрок па раскладу? Што робіць настаўніца? Што робяць вучні на ўроку? Куды запрасіў дзяцей школьны званок? Назавіце словы з гукам [ч].

4) Гульня “Перакладчык”

Я буду называць вам словы па-руску, а вы будзеце перакладаць на беларускую мову.

Учебник –

Тетрадь –

Расписание –

А цяпер я буду называць вам словы па-беларуску, а вы будзеце перакладаць на рускую мову.

Адказваць на пытанні –

Запрасіць на перапынак –

Матэматыка -

3. ***Аўдзіраванне***

1) Казачнік Бай запрашае вас на казку, у якой пойдзе гаворка пра птушыную навуку. Казка называецца “Птушыны каласок”. Разгледзьце малюнкі. Хто жыў на птушыным двары?

2) Паслухайце казку.

**Пшанічны каласок**

Жылі на адным двары курачка Сакатушка, гусак Шыпун ды індык Балбатун.

Курачка даглядала сваіх куранятак, грэблася на сметніку, шукала зярнятак. А гусак Шыпун і індык Балбатун толькі шпацыравалі (*прогуливались*) ўзад і ўперад па двары, як важныя паны, ды заўсёды вялі між сабою спрэчкі аб тым. хто з іх важнейшы і разумнейшы.

- У мяне галава большая, - хваліўся гусак, - дык і розуму ў ёй больш! Індык з гэтым не згаджаўся.

- Галава ў цябе вялікая, гэта праўда, ды дурная, - казаў ён.

- Ну, няхай сабе галава дурная, - адказваў гусак, - затое нос які вялікі ў мяне! Моцны (*крепкий*), цвёрды, прыгожы (*красивый*)... А ў цябе што за нос - смех адзін! Чарвяк, а не нос!

І гусак і індык былі страшэнныя гультаі. Яды шукаць сабе ленаваліся і таму часта галадалі.

Аднаго разу знайшла курачка каля плота пшанічны каласок. За-радавалася, засакатала на ўвесь двор:

- Ко-ко-ко! Глядзіце, які цудоўны (*чудесный*) каласок я знайшла!

Пачулі пра такую навіну Шыпун і Балбатун.

-Ану, пакажы!

Курачка паказала ім каласок. Індык панюхаў каласок сваім носам-чарвяком.

- Так, так, - сказаў ён, - каласок і праўда цудоўны. Трэба яго змалаціць.

- Ага, ага, - згадзіўся і гусак. - Трэба змалаціць. Тады будуць зярняткі. А яны смачныя (*вкусные*)... Ага, ага!

- Добра, - сказала курачка. - А хто яго змалоціць?

- Толькі не я! - адказаў гусак. - Я тоўсты, мне цяжка цэпам (*молотило*) махаць.

- Дык што ж, ты хочаш, каб я малаціў? - горача забалбатаў індык. Я табе не парабак (*работник*)!

- Ну добра, - сказала курачка, - я сама змалачу.

Пайшла яна на ток і змалаціла пшанічны каласок. Прынесла зярняткі і цешыцца (*радуется*):

- Глядзіце, якія цудоўныя зярняткі! Падышлі да зярнятак і гусак з індыком.

- Так, так, - сказаў індык. - Цудоўныя зярняткі.

- Ага, ага, - пацвердзіў гусак.

- Іх трэба змалоць ды напячы булак, - падаў разумную параду індык.

- Ага, ага, - згадзіўся гусак. - Пшанічныя булкі мяккія, як мой пух. А смачныя якія!

- Добра, - сказала курачка. - А хто змеле пшанічныя зярняткі?

- Толькі не я! - буркнуў гусак. - Мне цяжка ў млын хадзіць.

-1 не я! - усклікнуў індык. - 3 такою простаю работаю і дурны гусак справіцца.

- Ну што ж, - сказала курачка, - калі так, то давядзецца мне самой ісці ў млын (*на мельницу*).

Усыпала яна зярняткі ў торбачку і панесла ў млын. Там змалола і прынесла муку дахаты.

- Ах, якая бялюткая мука! - засакатала курачка на ўвесь двор.

Індык панюхаў муку.

-Так, так, - сказаў ён, - добра пахне. Значыць, смачныя будуць булкі.

- Ага, ага, я ж казаў, што смачныя! - уставіў слова і гусак.

- Ну, а хто спячэ з гэтай мукі булкі? - запыталася курачка. Гусак пакруціў галавою:

-Я не ўмею...Індык адказаў:

- Я хоць і ўмею, ды не хачу. Няхай гусак пячэ.

- Ну добра, - сказала курачка, - тады я сама спяку.

Такі прыемны пах пайшоў ад булак па ўсім двары, што ў гасака і індыка аж слінкі пацяклі.

А трэба сказаць, што яны даўно нічога не елі і так выгаладаліся, што нават спрачацца перасталі, хто з іх важнейшы ды разумнейшы.

- Хадзем у хату, - сказаў індык, - відаць,булкі ўжо гатовы.

- Ага, ага, - адказаў гусак. - Хадзем, брат, у хату.

Прыйшлі індык з гусаком у хату, а там курачка з печы булкі дастае. Мяккія, румяныя, пахучыя.

- Так, так, - весела загаварыў індык, - якраз у пару прыйшлі.

- Ага, ага, - заківаў галавою гусак і першы падаўся за стол. Індык – за ім.

Але курачка спыніла іх:

- Чакайце! Не спяшайцеся, панове! Перш чым садзіцца за стол, адкажыце мне на мае пытанні.

- Давай свае пытанні! - сярдзіта прашыпеў гусак. - Толькі хутчэй.

- Дык слухайце! Хто пшанічны каласок знайшоў?

-Ты, курачка, вядома, ты знайшла, - адказалі індык і гусак у адзін голас.

- Хто змалаціў каласок?

- Ты, курачка, змалаціла.

- Хто зярняткі ў млын насіў?

- Ты насіла...

- А хто дровы сек, у печы паліў, пшанічныя булкі пёк? Пераглянуліся паміж сабою індык з гусаком і адказалі:

- Ты, вядома... За гэта табе і слава.

- Дык вось, - сказала курачка Сакатушка, - каму слава, таму і булкі. А вы, гультаі (*бездельники*), ідзіце прэч адгэтуль! Ко-ко-ко! Дзеткі, бяжыце сюды хутчэй.

Пазбягаліся з двара кураняткі і пачалі з курачкай частавацца свежымі пшанічнымі булкамі.

А галодныя гультаі індык і гусак зноў заспрачаліся, хто з іх важнейшы ды разумнейшы.

3) Што аднойчы знайшла курачка Сакатушка? Што вырашылі зрабіць з каласком? Разгледзьце малюнкі і раскажыце, што зрабіла курачка з каласком. Праінсцэніруйце падзеі, адлюстраваныя на апошнім малюнку. Хто з герояў казкі вам падаўся смешным, хто ганарлівым, а хто працавітым? Каму б вы адрасавалі прыказку “На чужы каравай рот не разявай”.

4) ХВІЛІНКА АДКРЫЦЦЯЎ

а) Назвы якіх свойскіх жывёл вы пачулі ў казцы? Якія з іх вы ўжо ведаеце? Якія пачулі ўпершыню?

б) Разгледзьце ў сшытку малюнак, назавіце, каго на ім бачыце. Размалюйце яго.

5) Як адказвала курачка, калі гусак і індык не пагаджаліся малаціць каласок, малоць муку, пячы пірагі? Калі пагаджаюцца, то па-беларуску кажуць “добра”.

Практыкаванне “Падумай і адкажы”: Настаўнік выказвае прапановы, а дзеці, калі трэба, адказваюць “добра”. (Напрыклад: пакажы, калі ласка, падручнік; дай мне, калі ласка, сшытак).

### 4. Вынік урока

- Які гук вымаўляецца асабліва ў беларускай мове?
- Як трэба вымаўляць гук [ч]?
- Назавіце словы з гэтым гукам.
- Пра каго вы слухалі казку?
- Якія беларускія словы вы запомнілі на гэтым уроку?